Паўночная вайна, у якую Рэч Паспалітая была ўцягнута супраць волі, стала прычынай эканамічнага і палітычнага крызісу ў дзяржаве. Цэнтральная ўлада страчвала свае пазіцыі, абвастрылася рэлігійнае пытанне. Гаспадарка краіны была цалкам разбурана.

**1.** Якім чынам унутрыпалітычны канфлікт у ВКЛ садзейнічаў уцягванню Рэчы Паспалітай у Паўночную вайну?
**2.** Прааналізуйце падзеі 1700—1721 гг. паводле плана: 1) прычыны; 2) мэты; 3) удзельнікі; 4) вынікі.
**3.** Пры дапамозе тэксту параграфа растлумачце, як паўплывала на далейшы ход вайны бітва пры Лясной.
**4*.** Абмяркуйце, чаму падзеі Паўночнай вайны на тэрыторыі Беларусі некаторыя гісторыкі лічаць «еўрапейскім скразняком».
**5*.** Карыстаючыся тэкстам параграфа, картасхемай на с. 140 і дадатковымі крыніцамі, складзіце апавяданне пра адну з падзей Паўночнай вайны. Праілюструйце яго.

## § 21. Грамадска-палітычнае жыццё ў першай палове XVIII ст.

*Што такое залатыя шляхецкія вольнасці? Як выкарыстанне права ліберум вета ўплывала на палітычную сітуацыю ў краіне?*

У чым былі прычыны палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай?

**Унутрыпалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у пачатку XVIII ст.** Вяртанне на трон Аўгуста II зменшыла напружанне ў грамадстве. Былі памілаваны прыхільнікі Станіслава Ляшчынскага. Сапегам вярнулі іх ранейшыя пасады і ўладанні.

Кароль вырашыў скарыстаць момант і паспрабаваў умацаваць сваю ўладу ў Рэчы Паспалітай. Вялікай праблемай заставаліся пастаянныя зрывы сойма. Таму ў акружэнні караля з'явіліся ідэі рэфармавання сойма. Наступным крокам магло стаць усталяванне спадчыннай каралеўскай улады ў Рэчы Паспалітай. Супраць гэтых планаў выступіла большасць магнатаў і шляхты. Яны слушна лічылі, што так каралю будзе лягчэй уздзейнічаць на сойм.

*Як вы мяркуеце, чаму шляхта не была зацікаўлена ў правядзенні рэформаў?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Праціўнікаў пераўтварэнняў у ВКЛ узначаліў вялікі гетман, а пазней віленскі ваявода Людвік Пацей. Яго ўплыў у кране быў велізарным. Будучы падскарбіем ВКЛ, ён нават чаканіў на манетах разам з дзяржаўным і свой уласны герб.



▲ Саксонскі жаўнер

Аднак яшчэ не скончылася разбуральная вайна са Швецыяй. Да гэтага дадалася пагроза ваеннага канфлікту з Асманскай імперыяй. Прыхільнікі Станіслава Ляшчынскага вырашылі скарыстацца сітуацыяй і ўзняць паўстанне. Небяспечнае становішча ў дзяржаве вымусіла Аўгуста II увесці ў Рэч Паспалітую саксонскія войскі. Цяжар іх утрымання і злоўжыванні саксонцаў выклікалі паўстанне шляхты. У *сакавіку 1716 г.* была арганізавана Генеральная канфедэрацыя ВКЛ у Вільні. Яе прыхільнікі паўсюль змагаліся з саксонскімі войскамі. Аўгуст II быў вымушаны саступіць і пагадзіцца на расійскае пасрэдніцтва ў прымірэнні з канфедэратамі.

**«Нямы» сойм 1717 г.** Дамова паміж шляхтай і каралём зацвярджалася на сойме **1717 г.**, які працягваўся ўсяго адзін дзень. Тэкст дагавора быў прыняты як соймавая пастанова моўчкі, без абмеркавання. У сувязі з забаронай выкарыстоўваць права ліберум вета і праводзіць дыскусіі сойм і атрымаў назву «нямы».

Пастановы «Нямога сойма» абмяжоўвалі правы караля, магнатаў і шляхты. Манарху забаранялася раздаваць пасады і землі замежнікам. Да таго ж у Рэчы Паспалітай не мелі права знаходзіцца саксонскія войскі і чыноўнікі. Сойм быў павінен склікацца кожныя два гады, незалежна ад каралеўскай волі.

Усе пастановы супраць магнатаў абмяжоўвалі ў першую чаргу паўнамоцтвы гетманаў. Менавіта гэтыя ўраднікі найбольш уплывалі на ўнутраную палітыку Рэчы Паспалітай падчас Паўночнай вайны.


Правообладатель Издательский центр БГУ

Сойм забараніў гетманам свабодна размяркоўваць падаткі на войска і выкарыстоўваць жаўнераў у прыватных мэтах. Ім не дазвалялася кантактаваць з урадамі замежных краін. У сваю чаргу, шляхце забаранялася самастойна склікаць соймікі. Былі праведзены таксама фінансавая і вайсковая рэформы.

| Асноўныя кірункі вайсковай рэформы | | | |
|---|---|---|---|
| Увядзенне пастаяннага падатку на ўтрыманне войска | Абмежаванне паўнамоцтваў гетманаў | Абмежаванне колькасці дзяржаўнага войска да 24 тыс. чалавек (з іх 6 тыс. войска ВКЛ) | Пераўзбраенне |

▲ Вайсковая рэформа 1717 г.

? *Растлумачце, як былі звязаны паміж сабой вайсковая і фінансавая рэформы.*

Пастановы «Нямога сойма» спынілі ўзброеныя канфлікты ўнутры дзяржавы і ўсталявалі мір. Аднак іх гістарычнае значэнне было непараўнальна большым. Яны амаль што на пяцьдзясят гадоў вызначылі асаблівасці дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. У яго аснову быў пакладзены прынцып раўнавагі галоўных палітычных сіл: караля, магнатаў і шляхты. Але на справе праведзеныя пераўтварэнні аслабілі пазіцыі ўсіх гэтых сіл. У выніку палітычную сістэму Рэчы Паспалітай ахапіў крызіс. Усё гэта здолела выкарыстаць у сваіх інтарэсах Расія.

**Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай.** Расія была зацікаўлена ў аслабленні Рэчы Паспалітай і пачала актыўна ўмешвацца ва ўнутрыпалітычнае жыццё дзяржавы. Выбары наступнага караля ў Рэчы Паспалітай у 1733 г. прывялі да канфлікту паміж еўрапейскімі дзяржавамі. Францыя, Іспанія і Сардзінія падтрымлівалі Станіслава Ляшчынскага. Расія і Аўстрыя выступалі за кандыдатуру Фрыдрыха Аўгуста Саксонскага, сына Аўгуста II. Увядзенне расійскіх войскаў у Рэч

*Як вы лічыце, чаму Расія імкнулася ўзмацніць свой уплыў у Рэчы Паспалітай?*

Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Аўгуст III. Мастак *Л. дэ Сільвестр*. XVIII ст.

Паспалітую забяспечыла выбар яго каралём. Ён прыняў троннае імя Аўгуста III (гады кіравання *1733—1763*).

У сваёй палітыцы Расія стала абапірацца на магнацкую групоўку, якая атрымала назву «Фамілія». Яе ўзначальвалі прадстаўнікі роду Чартарыйскіх і іх сваякі Панятоўскія. «Фамілія» неўзабаве стала і прыдворнай групоўкай пры каралю Аўгусце III.



▲ Міхал Чартарыйскі. Мастак *Л. дэ Сільвестр*. XVIII ст.



Міхал Чартарыйскі (1696—1775) — канцлер ВКЛ. Адзін з арганізатараў і лідараў групоўкі «Фамілія». Выступаў за рэформу дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай пры расійскай падтрымцы. Лічылася, што ён ведаў імёны і прозвішчы ста тысяч шляхціцаў, іх інтарэсы і памкненні. Каралю ён рэкамендаваў прызначаць на дзяржаўныя пасады не заможных, а здольных людзей. Меў вялікую эрудыцыю, карыстаўся павагай сучаснікаў. Расійскі пасол пасля яго смерці зазначыў, што «ў Варшаве не засталося нікога, перад кім можна зняць капялюш».

*Пра якія асабістыя якасці М. Чартарыйскага сведчыць выказванне расійскага пасла?*

**Крызіс выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады.** Падзеі Паўночнай вайны прывялі да таго, што соймы даволі доўгі час не склікаліся. Таму пытанні падаткаў, найму і ўтрымання войска самастойна вырашалі павятовыя соймікі. У выніку значная частка грошай заставалася ў павеце, а дзяржаўны скарб не папаўняўся.

Рашэнні «Нямога» сойма змянілі сітуацыю. Самастойнасць павятовых соймікаў была абмежавана. Шляхта страціла магчымасць прымаць патрэбныя ёй рашэнні. Таму зрыў соймікаў стаў звычайнай справай.


Правообладатель Издательский центр БГУ



▲ Група апазіцыі на сойміку. Мастак *Я. П. Норблін.* Пачатак XIX ст.

? *На малюнку частка шляхты пратэстуе супраць рашэння сойміка. Як вы думаеце, чаго магло тычыцца гэтае рашэнне?*

**Апісанне мсціслаўскага пасольскага сойміка 1732 г.**

Пан Лявон Ільініч, гродскі пісар з партыі Валовіча, маючы ў руках старую… сякерку тонкай работы, хацеў ёю ўдарыць у лоб падстарасту Шпілеўскаму, але той уцёк, а Станіслаў Валовіч ускочыў на стол і выхапіў шаблю; тады абедзве партыі не ленаваліся, асабліва калі два браты Завістоўскія перакулілі стол на партыю Валовічаў. Секаніна працягвалася каля гадзіны. (Цыт. па: *Мальдзіс А.* Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мінск, 2001).

*Карыстаючыся тэкстам дакумента і матэрыялам параграфа, растлумачце, якім чынам шляхта вырашала спрэчныя пытанні на сойміках у XVIII ст. Чым гэта было абумоўлена?*

Каралі Аўгуст II і Аўгуст III шмат часу аддавалі справам у сваёй роднай Саксоніі. Асабліва гэта тычылася Аўгуста III, які наогул

Правообладатель Издательский центр БГУ

з'яўляўся ў Рэчы Паспалітай толькі на соймы. Доўгая адсутнасць караля ў дзяржаве і барацьба магнацкіх груповак прывялі да крызісу выканаўчай і заканадаўчай улады. Так, у панаванне Аўгуста III з 15 соймаў безвынікова сваю працу скончылі 14. Рэгулярныя зрывы соймаў не дазволілі правесці рэформы войска, фінансавай і судовай сістэм.

Армія Рэчы Паспалітай моцна саступала арміям суседніх дзяржаў. Яны, наадварот, значна павялічылі свае арміі. Для Рэчы Паспалітай любы канфлікт з суседзямі станавіўся небяспечным. У такіх абставінах набыла папулярнасць ідэя павелічэння войска. Аднак ажыццявіць яе было немагчыма, бо шляхта не жадала ўводзіць новыя падаткі на ўтрыманне арміі.

Крызіс ахапіў і судовую сістэму Рэчы Паспалітай. У паветах не хапала суддзяў, таму судовыя справы разглядаліся вельмі доўга. Гэта вымушала шляхту адразу звяртацца ў Галоўны Трыбунал ВКЛ. Да таго ж на яго пасяджэннях былі вымушаны разглядаць і справы, рашэнні па якіх звычайна выносіў сойм. Зараз гэта стала немагчыма, бо, як ужо згадвалася раней, амаль усе соймы зрываліся. Гэта яшчэ больш паглыбляла крызіс дзяржаўнай улады ў Рэчы Паспалітай.

*Калі і з якой мэтай быў створаны Галоўны Трыбунал ВКЛ?*

Паўночная вайна аслабіла цэнтральную ўладу і ўзмацніла ўплыў магнацкіх груповак у дзяржаве. Барацьба паміж імі прывяла да крызісу заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады. Пазіцыі Рэчы Паспалітай на міжнароднай арэне значна аслаблі. У яе справы пачалі ўмешвацца замежныя краіны. Расія з 1730-х гг. стала адыгрываць вырашальную ролю нават ва ўнутранай палітыцы Рэчы Паспалітай.

**1.** Знайдзіце ў тэксце параграфа пацвярджэнні выснове: «У першай палове XVIII ст. пачаўся крызіс улады ў Рэчы Паспалітай».
**2.** Назавіце прычыны ўзнікнення Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ 1716 г. Як гэтыя прычыны характарызуюць стасункі паміж шляхтай і каралём?
**3.** Якія рашэнні былі прыняты соймам 1717 г.? Чаму ён атрымаў назву «Нямы»?


Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Як пастановы «Нямога» сойма 1717 г. паўплывалі на далейшае развіццё Рэчы Паспалітай?
5*. Падзяліцеся ў класе на прыхільнікаў караля і магнацкай групоўкі. Паспрабуйце пераканаць сваіх праціўнікаў у слушнасці сваёй пазіцыі па пытаннях падаткаў, павелічэння войска, змен у працы судоў.

## § 22. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў першай палове XVIII ст.

*Якія падзеі пачатку XVIII ст. паўплывалі на развіццё беларускіх зямель?*

Якім чынам адраджалася гаспадарка? Чым мануфактуры на беларускіх землях адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх?

**Гарады і гандаль у першай палове XVIII ст.** Ад ваенных канфліктаў пачатку XVIII ст. у Рэчы Паспалітай больш за ўсё пацярпелі беларускія землі. Да ваенных спусташэнняў дадаліся і іншыя нягоды.




▲ Змены колькасці насельніцтва беларускіх зямель у сярэдзіне XVII — першай палове XVIII ст., млн чалавек

**З Магілёўскай хронікі**

1706 г. У гэтым годзе была лютая зіма, стаяла доўга, снягі былі невыносныя і нечувана вялікія, што не толькі звяр'ё, птушкі, але і людзі на дарогах замярзалі. І была дарагоўля збожжа і розных харчовых тавараў.

*Пры дапамозе дыяграмы, урыўка з дакумента і раней атрыманых ведаў пракаментуйце прычыны і змены колькасці насельніцтва ў 1648—1721 гг.*

Правообладатель Издательский центр БГУ